УДК 821.161.3.09

**В.І. Караткевіч (Магілёў)**

# АСАБЛІВАСЦІ АДЛЮСТРАВАННЯ ЭКАЛАГІЧНЫХ ПРАБЛЕМ У КАЗКАХ АЛЕСЯ КАРЛЮКЕВІЧА

**Аннотация**.В статье рассматривается специфика отражения экологических проблем в сказках Алеся Карлюкевича для детей. Данные произведения свидетельствуют об особом внимании белорусских писателей к проблемам окружающей среды, а также об изменениях подходов в экологическом воспитании детей на рубеже XX и XXI вв.

**Summary**.This article deals with the specifics of ecological problems in Ales Karlyukevich's fairy-tails for children. These works testify to the special attention of Belarusian writers to environmental problems as well as to the change of ecological education for children at the turn of XX–XXI century.

Казка заўсёды адыгрывала важную ролю ў жыцця дзяцей, фарміруючы ў асобе малога слухача (чытача) сістэму маральных прыярытэтаў, этычных і эстэтычных каштоўнасцяў. Гэты тэзіс застаецца актуальным і для мяжы XX і XXI стст. У гэты час адной з найважнейшых з'яўляецца праблема экалагічнага выхавання дзяцей. Пры гэтым з ся-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

рэдзіны 1980-х гг. назіраюцца істотныя змены ў фарміраванні экалагічнай свядомасці малых чытачоў і слухачоў. Гэта звязана са зменамі разумення прыроды не як службы чалавека, а як асяродка, у якім неабходна жыць. На гэтай хвалі з'яўляюцца цікавыя ўзоры пазнавальнай (напрыклад, "Насякомыя: Шасціногія суседзі" (2005) Л. Чумакова, "Грыбы: Вялікая таямніца прыроды" (2006) Я. Шапаравай, "Сакрэты кветак для дарослых і дзетак" (2010) П. Грынчанка і А. Церашковай) і выхаваўчай ("Госць з Чырвонай кнігі", "Зорачка" (1997) Э. Луканскага, "Як вясну рабілі" (1985) І. Грамовіча, "Навошта ружы калючкі" (1995) Д. Слаўковіча, "Ратан" (1999) А. Федарэнкі, "Вясёлыя скокі" (2003) В. Макарэвіча, "Лясная сімфонія", "Пчолы і трутні" (2004) В. Гурскага) скіраванасці творы для дзяцей.

У гэтым кантэксце асобае месца займаюць казкі з экалагічнай скіраванасцю Алеся Карлюкевіча. У цэнтры нашай увагі будуць творы гэтага пісьменніка, змешчаныя ў зборніку "Блакітная кніга" (2009), якія прысвечаны беларускім рэкам, азёрам, вадаёмам. У прыватнасці гэта "Зорны шлях белых гарлачыкаў", "Пісьмо сям'і панадціставак".

Гэтыя дзве казкі ўяўляюць сабой своеасаблівы сімбіёз "выхаваўчага" і "пазнавальнага" матэрыялу, што дае падставы суадносіць іх з экалагічнымі казкамі. Тут у фантазійнай манеры адлюстраваны прыродныя з'явы, аб'екты ў прыроднай узаемасувязі.

Так, казка "Зорны шлях белых гарлачыкаў" пазбаўлена мастацкай умоўнасці, дзеянне адбываецца на Палессі ў час Сёмухі. Аўтар імкнецца перадаць атмасферу, якая пануе ў час свята, а таксама праз апісанне ўнікальнага заходнепалескага абрада "Ваджэне куста" ("Куста"). Звернем увагу і на спецыфічныя рысы мовы палешукоў у абрадавай песні: *"Ой, мы булі ў вэлікому лісі, // Звілі Куста з зэлэнэго клену. // Выйдзі, пане, з нового покою. // Да вынесі Кусту хоць по золотому* <...>*"* [1, с. 125]. Фінальным акордам абрадавых дзеянняў з'яўляецца агульная вячэра ў адной з вялікіх вясковых хат. Адзначым, што падрабязнае апісанне свята Сёмухі мае вялікае пазнавальнае значэнне для дзяцей, якія знаёмяцца з часткай нематэрыяльнай гістарычнай спадчыны беларускага народа.

Менавіта з застолля пачынаецца ўласна казачнае дзеянне, бо тут паказана еднасць людзей і буслоў. Прычым гутарка з птушкай паказваецца надта арганічна і натуральна. У казачную прастору "ўплецена" некалькі жыццёвых гісторый, кульмінацыйнай сярод якіх з'яўляецца гісторыя пра белыя гарлачыкі. Гэтыя кветкі паходзяць з зорак, што ўпалі на зямлю.

Заўважым, што рухаючай сілай гэтай казкі А. Карлюкевіча "Зорны шлях белых гарлачыкаў" з'яўляецца не востры канфлікт, а адлюстраванне гармоніі чалавека і прыроды. Асноўная ідэя заключана ў апошняй фразе галоўнага казачнага апавядальніка: *"«Дзякуй зоркам, што падаравалі буслам такую прыгажосць!» – толькі і падумаў стары Ладымер, у каторы раз падзякаваўшы Богу за тое, што Усявышні чалавека і бусloў у сяброўстве злучыў"* [1, с. 128].

Такім чынам, прапанаваная казка мае цікавую структуру: чыста рэалістычнае абрамленне і казачна-апавядальнае ўнутранае напаўненне, праз якое аўтар імкнецца давесці рэцыпіенту прыгожую легендарную гісторыю белых гарлачыкаў на саджалцы і народную мараль пра сакральнае (!) злучэнне прыроды і чалавека.

Іншыя экалагічныя ідэі закладзены ў казцы "Пісьмо сям'і панадціставак". У гэтай казцы расказваецца пра трагедыю матылькоў, якія жывуць у міжрэччы Свіслачы і Цітаўкі. Звернем увагу, што аўтар, як і ў папярэдняй казцы называе дакладнае месца падзей: месца пражывання насякомых і месца знаходжання вучонага Энтамолага – Бярэзінскі запаведнік. Таксама героі матылькі набываюць поўную формулу імя: уласнае імя, прозвішча. Гэтым падкрэсліваецца рэалістычнасць апісанняў таго, што адбываецца.

Сюжэт гэтай казкі грунтуецца на адлюстраванні падарожжа Мар'яна Прытычанскага ў Бярэзінскі запаведнік да Энтамолага з просьбай дапамагчы пазбавіцца ад кажаноў, якія быццам раптоўна пачалі паядаць панадціставак, з-за чаго іх папуляцыя пачала рэзка змяншацца.

Аўтар звяртае ўвагу дзяцей на той факт, што кожны ў гэтым свеце з'яўляецца самакаштоўным, нават самы малы

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

матылёк здольны змяніць свет. Стары Ціт Гачкаўскі, самы стары матылёк, сцвярджае: *"Не будзе нас – свет зменіцца. Вы павінны ведаць, што прысутнасць кожнага на зямлі – прыдумка, якую нельга абвергнуць, змяніць. І мы абавязаны жыць згодна аднойчы вынайдзеным прыродай законам. Старэйшае за мяне пакаленне панадціваак расказвала пра тое, што свет настолькі ўзаемазвязаны, што ад кольkaсці ўзмахаў крыламі аднае панадцітаўкі залежаць павевы ветру на другім баку свету..."* [1, с. 142]. Гэтая ў пэўнай меры пафасная прамова павінна падвесці рэцыпіента да думкі, што жыццё, якое табе дадзена самакаштоўнае і, нягледзячы на складанасці, трэба ісці ўперад і не забываць, "што ад узмаху тваіх крылаў" залежыць рух сілы, якая пераўзыходзіць цябе ў дзясяткі-сотні-тысячы раз.

Акрамя выхавання, аўтар засяроджвае ўвагу на пазнавальным аспекце: падае звесткі пра цыкл з'яўлення матылькоў (*"Як толькі надыходзіў час, вылупліваліся з яек, з'ядалі свой уласны "дамок" – абалонку яек... Выраслалі ў вусеняў. Пасля пакрываліся коканам. І толькі з часам выпростваліся ў драбнюткіх матылькоў"* [1, с. 140], мову матылькоў (размовы вядуцца праз маханне крылцамі), харчовыя прыхільнасці матылькоў.

У казцы "Пісьмо сям'і панадцітавак" аўтар паказвае, што самы маленькі можа здзейсніць самае вялікае, а самы сціплы – самае нечаканае. Аўтар падкрэслівае неабходнасць усяго на свеце, адсутнасці "непажаданых" істот. Нават кажаны, якія паядаюць панадцітавак не дэманізуюцца.

Такім чынам, казкі Алеся Карлюкевіча "Зорны шлях белых гарлачыкаў", "Пісьмо сям'і панадцітавак" з'яўляюцца паказальнымі ўзорамі спалучэння дзвюх галоўных функцый дзіцячай літаратуры – пазнавальнай і выхаваўчай. Такога роду творы неабходныя для падсвядомага ці свядомага навучання дзіцяці правілам і маралі жыцця, фарміравання сістэмы маральна-этычных каштоўнасцяў, а таксама ўсведамлення неабходнасці абароны арэала свайго існавання і дастойных адносін да наваколля і тых людзей, якія вакол. У названых казках назіраецца змена парадыгмы маралі: калі раней прырода выступала служкай, то цяпер у свядомасць дзяцей укладваецца ідэя пра непарушнасць сувязі ўсяго жывога на Зямлі. Гэта падкрэсліваецца адсутнасцю "чужога" ("варожага") свету ў згаданых казках і падкрэсленым сцверджаннем неабходнасці падтрымання прыроднай раўнавагі і роўнакаштоўнасці ўсяго існага, незалежна ад памеру, працяглaсці жыцця і г.д. Разам з тым, творы А. Карлюкевіча нясуць важную "экалагічную інфармацыю": даюць звесткі пра "экалагічную абрадавасць" беларусаў, веды пра пэўных жывых істотах. У даступнай форме даецца тлумачэнне сутнасці экалагічных праблем і прычыны іх узнікнення. У адрозненні ад фальклорных казак, тут утрымліваецца іманентны дыдактызм, які прама не дэманструецца.

*ЛІТАРАТУРА*


1. Блакітная кніга ў творах беларускіх пісьменнікаў / уклад. А. Масла ; маст. Т. Шэлест. – Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2009. – 152 с.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова